**А. В. Ванькові́ч (Мазыр, Беларусь)**

## ТЭКСТ ЯК ФАКТАР ІНТЭГРАЦЫІ РОЗНЫХ НАВУК І ДЫСЦЫПЛІН
## (на прыкладзе газетных публікацый Уладзіміра Пугача)

Лірычныя эцюды, пейзажныя замалёўкі, запіскі натураліста, газетныя мініяцюры – так беспамылкова можна назваць невялічкія, на паўстаронкі, творы петрыкаўскага публіцыста Уладзіміра Пугача. Увага да яго творчай асобы стала асабліва вострай у час выкладання на філалагічным факультэце УА “МДПУ імя І. П. Шамякіна” курса “Літаратурнае краязнаўства”. У межах гэтай дысцыпліны студэнты аб’ядноўваліся ў групы паводле месца свайго нараджэння і даследавалі літаратурна-культурныя традыцыі іх маленькай радзімы. Вось тады побач з іншымі імёнамі рэгіянальна-мясцовых аўтараў “усплыло” імя У. Пугача – ураджэнца Петрыкаўшчыны ў Гомельскай вобласці, былога настаўніка біялогіі і дырэктара Навасёлкаўскай школы, творы якога друкаваліся ў “Чырвонай змене”, “Роднай прыродзе”, “Юным натуралісце”. Але найперш яго літаратурная дзейнасць звязана з раённай газетай “Петрыкаўскія навіны”, дзе ён доўгі час вёў рубрыку “Зямное рэха” і друкаваў свае замалёўкі, і літаратурна-мастацкімі альманахамі “Рачныя напевы”, “Галасы Палесся”, “Жыві, мая крыніца” пры газеце. Апагеем стаў выхад у 1998 годзе ў Мінску зборніка “Флейтавыя гукі”. І па сённяшні дзень на старонках раённага выдання друкуюцца новыя і новыя творы У. Пугача. У асобе гэтага цікавага чалавека зліліся ў цесным адзінстве, вобразна кажучы, празаік і паэт, філолаг і біёлаг, мастак і кампазітар, настаўнік і цудоўны бацька, дзед, прадзед.

Як вядома, адной з сучасных педагагічных тэхналогій школы і ВНУ з’яўляецца інтэгральная тэхналогія (“інтэгрыраваць” – аб’ядноўваць у адзінае цэлае). Даказана, што традыцыйная мадэль адукацыі ўжо не задавальняе новым патрабаванням часу – яна арыентавана на дысцыплінарную дыферэнцыяцыю, парушае натуральную сувязь паміж школьнымі прадметамі. Інтэграцыя ж розных вучэбных дысцыплін развівае эмацыянальную сферу вучня, яго пачуцці, душу. Сінтэз мастацтваў, іх узаемадапаўненне дапамагае ўбачыць багацце і разнастайнасць свету, спрыяе больш глыбокаму, эмацыянальнаму раскрыццю мастацкага вобраза.

У кантэксце праблемнага поля канферэнцыі разглядзім замалёўкі У. Пугача як самастойныя тэкставыя адзінкі, як фактар (ням. Faktor ад лац. factor – “які

МГПУ им. И. П. Шамякина

робіць, ставрае") інтэграцыі розных навук і дысцыплін, сінтэз мастацтваў. Творы пісьменніка сапраўды аб'ядноўваюць у адзінае цэлае педагогіку, літаратуру, мову, біялогію, медыцыну, геаграфію, гісторыю, выяўленчае мастацтва, музыку і інш. і з'яўляюцца цікавай знаходкай для настаўніцкага асяродку (найперш, безумоўна, для педагогаў Петрыкаўшчыны).

Газетныя публікацыі У. Пугача па сваёй жанравай прыналежнасці – мастацка-публіцыстычныя творы, у якіх арганічна спалучаюцца вобразнае адлюстраванне рэчаіснасці і дакументальнасць. Аўтар прадмовы да зборніка "Флейтавыя гукі" М. Юхневіч, старшыня Петрыкаўскай раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, нездарма адзначыў, што "замалёўкі У.М. Пугача ў некаторай ступені дапаўняюць літаратуру, прысвечаную вечнай тэме – прыродзе" [1, 3], чым зрабіў акцэнт найперш на мастацкай прыродзе замалёвак. Мы таксама будзем умоўна лічыць гэтыя тэксты найперш прыналежнасцю літаратуры як віда мастацтва і як дысцыпліны, якая вывучаецца ў школе і ВНУ.

Перш за ўсё трэба адзначыць ***педагагічны*** аспект замалёвак У. Пугача. Пісьменнік як чалавек, звязаны са школай (настаўнік, дырэктар), бацька, дзед, прадзед не можа не "выхоўваць" чытача. Тэма выхавання, сямейнай педагогікі, адносін паміж бацькамі і дзецьмі прысутнічае нават у замалёўках, здавалася б, чыста пейзажнага характару: *"З прыбярэжных кустоў, заросшых рознымі травамі, спяшаецца да рэчкі качыны вывадак. Малыя папіскваюць, абганяюць адзін аднаго. Маці клапатліва вядзе іх да воднай стыхіі"* [2, 29]. Прымушае ўсміхнуцца гісторыя пра чаротніцу, сямейная пара якой *"праяўляе асаблівыя клопаты аб патомстве"* [1, 93]: *"У гняздзе сямейнай парачкі неўзабаве з'явілася шэсць рабых яек. Наседжвалі бацькі іх па чарзе. Праз дваццаць дзён убачылі свет двое птушанят, і самка з імі адправілася ў водную прастору. Чатыры яйкі яшчэ засталіся ляжаць у гняздзе. Самец чамусьці ў той дзень адсутнічаў, затое назаўтра ён не пакідаў гнязда. Яшчэ тры дні клапатлівы бацька саграваў яйкі. І вось доўгачаканы момант настаў. Чацвёра птушанят аставілі гняздо"* [1, 92–93].

Гэтак жа актуальна ўзнімаецца ў творах і тэма калектыўнай і сямейнай салідарнасці, узаемападтрымкі: *"Драпежнік ледзь не схапіў дразда. Добра, што той нарабіў гвалту ды крыку. На дапамогу зляцеліся сваякі. На ўвесь лес шуму нарабілі. Шмыгаюць між дрэў, кідаюцца на коршуна, скубуць яго з усіх бакоў. Драпежнік круць-верць, ды наўцёкі. Напалоханы драздамі, ён здаецца, больш не пакваліцца на лёгкую здабычу. Вось што значыць калектыўная абарона"* [1, 31].

Як аб'ект ***літаратуразнаўчага*** аналізу замалёўкі вельмі каштоўныя сваёй мастацкай вобразнасцю, лірызмам. З іх паўстае асоба аўтара – эстэта, чалавека з тонкім светаўспрыманнем і вельмі чуйнай душой, які захапляецца прыроднай прыгажосцю, напрыклад, кветкай медуніцы: *"Доўга любаваўся я гэтай прыгожай раслінкай. Рваць не асмеліўся. Так моцна заінтрыгавала расліна сваёй знешнасцю"* [2, 27]. У самых звычайных, здавалася б, праяўленнях жыцця прыроды паэтычная натура мастака слова бачыць дзівосныя рэчы, таямнічыя і загадкавыя: гняздо рэмеза нагадвае яму збаночак, цярпліва і з захапленнем назірае ён паядынак старога і маладога ласёў ў барацьбе іх за самку, цікаўна сочыць за проціборствам у пошуках ежы ястраба і *"настойлівай рыжухі"* [3, 8].

Багатая ў мастака слова і фантазія, асацыятыўнае мысленне, паэтычнае бачанне свету. Воблакі ён называе эпітэтамі "пульхныя", "заспаныя, ускудлачаныя", а іх саміх бачыць так: *"Вось заяц са львом плывуць побач. Воддаль слон з даўжэзным хобатам нешта шэпча лісе. Уперадзе іх воблачкі-жураўлі. Толькі іх жыццё зусім кароткае. Наляцеў вецер і давай шматаць, рваць гэтыя воблакі. Заяц скурчыўся, кульнуўся і на вачах ператварыўся ў лягушку. А воблака-слон неўзабаве разарвалася на пушыстыя шматкі. Воблака-ліса не скарылася ветру. Праўда, крыху хвост усё ж адарваўся"* [1, 111].

Творы У. Пугача ўражваюць свежымі, трапнымі аўтарскімі параўнаннямі, што таксама падкрэслівае іх літаратурна-мастацкую спецыфіку: *"Вясна ідзе. Аблашчаныя цёплым ветрыкам, раскрываюцца на вярбе пупышкі. Раніцой дрэва стаяла голае, а пад вечар пушыстыя камячкі разбегліся па галінках і сядзяць, бы кураняты, што толькі што вылупіліся з яіц"* [1, 6]. Дэталёва і вельмі рамантычна апісаны знешні выгляд лістоў падалешніка: *"Буйныя зялёныя лісты, быццам вычышчаныя да бляску ці змазаныя алеем, кідаюцца ў вочы асабліва. Яны падобныя на капыты жарабяці. Прыбегла яно калісьці з чароўнай казкі, пакінула сляды, якія і ператварыліся ў шчыльныя круглыя лісты"* [1, 15]. А расліну-паразіта – таемніка – пісьменнік і характарызуе адпаведна: *"Невысокія ружова-белыя сцяблінкі, падобныя на тлустых дажджавых чарвякоў, што прабіліся з глебы побач яблыні…"* [1, 16].

З літаратурай цесна звязана ***вусная народная творчасць***. У. Пугач часта згадвае ў замалёўках легенды, пачутыя ім ад мясцовых жыхароў, народныя павер'і і прыкметы, святы беларусаў-палешукоў, чым папулярызуе мясцовы фальклор: *"Па легендзе, ягады ярка-чырвоныя таму, што калісьці ландыш аплакваў адышоўшую вясну такімі горкімі слязамі, што кроў выступіла з яго сэрца і афарбавала зялёныя слёзы-ягады"* [1, 13]; *"Здаўна на Купалле людзі збіралі лекавыя зёлкі і асабліва многа святаянніка. Гэтая расліна лічылася сродкам ад дзевяноста дзевяці хвароб"* [1, 26]. Настаўнік біялогіі па адукацыі, У. Пугач шмат увагі надае найменням кветак і раслін, ведае не толькі іх навуковыя, але і народныя імёны: шчамяліцу завуць *"мядзведжая трава, сіненькі карэньчык, пасечная трава, падарэшына, валовы язык"* [1, 14]; падалешнік – *"шкіпінарнікам ці лясным перцам"* [1, 16], грыб вясёлку – *"чортавымі яйкамі"* [1, 32]; плакун-траву – *"слёзнікам, гарлёўнікам, ракавымі шыйкамі; ляўконіяй палявой"* [1, 29]; жучкоў-светлячкоў у некаторых вёсках – *"іванавымі чарвячкамі"* [1, 18], таму што іх больш за ўсё перад святам Купалля.

Лінгвістычнае багацце мініяцюр У. Пугача прывабіць настаўніка-***моваведа***. Тут – і прыклады навуковых тэрмінаў (*"рыльца", "песцік", "фотасінтэз", "лятучыя рэчывы"* і інш. ), і вышэй адзначаныя ўзоры народных найменняў кветак і ягад, і тапонімы (*Пціч, Арэса, Капцэвічы* і інш.). Творы У. Пугача можна параіць выкарыстоўваць у якасці ўдзячнага дыдактычнага матэрыялу моваведам (найперш Петрыкаўшчыны) пры вывучэнні лексікалогіі, стылістыкі, сінтаксісу, пунктуацыі. Найбольш многа прыкладаў можна знайсці па тэмах "Аднародныя члены сказа", "Сказы па мэце выказвання і інтанацыі", "Стылі мовы". Як ні дзіўна, сам аўтар часта робіць заўвагі моваведчага характару: *"Здаўна сябруюць людзі з бярозай, добрай нашай беластволай прыгажуняй. І слова "бяроза" адзінае ва ўсіх славянскіх мовах"* [1, 10]; *"Ландыш у перакладзе з лацінскага азначае "лілея далін, квітнеючая ў маі"* [1, 13]. Цікава было б сумясціць урокі мовы з урокамі беларускай літаратуры па вывучэнню твораў пісьменнікаў-землякоў.

МГПУ им. И.П.Шамякина

Замалёўкі У. Пугача багатыя фактычным матэрыялам, звязаным з флорай і фаунай Беларусі, кліматам і ландшафтам, што будзе цікава настаўнікам ***біялогіі*** і ***геаграфіі***. Пісьменнік апісвае знешні выгляд жывёл і птушак, іх нораў, адзначае каштоўнасць кожнай расліны, яе спецыфічныя ўласцівасці (дзе расце, як і калі цвіце), прымяненне ў народнай і традыцыйнай медыцыне і г. д. Падрабязна апісаны тут і “насельнікі” Чырвонай кнігі (беркут, сыч, чорны і белы буслы, званочкі персікалістыя і інш.). З паэтычных мініяцюр перад намі паўстае, акрамя таго, асоба гаспадарлівага прыродалюба: *“Між пуховага пер’я ляжала 9 яек. Жытло акуратна паправіў”* [2, 27]; *“Патрывожаныя мурашы, што падняліся наверх, без спешкі рамантавалі сваё жытло. <...> Прыйшлося аказаць дапамогу насякомым”* [4, 6]. Ужыванне разнастайнай біялагічнай, батанічнай, заалагічнай, медыцынскай, хімічнай тэрміналогіі не перашкаджае, аднак, пазнавальнаму зместу замалёвак. Некаторыя факты, прыведзеныя аўтарам, здзіўляюць сваёй незвычайнасцю: *“Вялікая чорная птушка корпалася ў разгрэбленым доміку насякомых. Яна варочалася сюды-туды, адтапыранымі крыламі стукала, бы гусь па вадзе. Я распазнаў крумкача. Так ён вызваляўся ад насякомых-паразітаў, што пасяляюцца ў пер’і, бо мурашыная кіслата іх забівае”* [4, 6]. Цікава будзе даведацца таксама пра тое, што ягады бузіны *“часам прымяняюць у якасці туалетнага мыла: яны не даюць пены, але добра адмываюць гразь з рук, нават тэхнічнае масла. І рыбаловы выкарыстоўваюць ягады як насадку на кручок”* [1, 12], і пра шэраг іншых цікавых фактаў .

У. Пугач – яшчэ і фітатэрапеўт, траўнік, які ў мініяцюры “Крыніца здароўя” вучыць чытача метадыцы збірання лекавых раслін і ведае, *“як і калі іх збіраць, як сушыць, колькі часу захоўваць, каб не зніклі гаючыя ўласцівасці”* [1, 11–12], *“трэба іх толькі зрэзваць, а не вырываць з каранямі”* [1, 12], *“трэба пакідаць некалькі раслін для ўзнаўлення”* [1, 12], збіраць лепш *“у сонечнае надвор’е і да дванаццаці гадзін дня”* [1, 12] і г. д. Аўтар перажывае пра валяр’ян: *“Расліны часта вырываюць з каранямі на лекі. Такім чынам, гэтай зёлцы наканаваны горкі лёс”* [1, 34]. Пісьменнік раіць паспрыяць размнажэнню лекаў – сабраць насенне і раскідаць у сырых месцах. Аўтар вучыць, як правільна сябе паводзіць у лесе, сустрэўшы гадзюку: *“Першай гадзюка ніколі не нападае. Толькі раззлаваная, калі наступіш на яе, яна можа ўкусіць свайго крыўдзіцеля. <...> Скураны і гумавы абутак гадзюка пракусіць не можа”* [1, 108]. Такім чынам, чытачам даюцца і канкрэтныя парады практычнага характару.

Мініяцюры прыцягнуць цікавымі фактамі і настаўніка ***гісторыі***. Замалёўка “Карысныя птушкі” расказвае: *“У Кітаі ў час культурнай рэвалюцыі знішчалі вераб’ёў рознымі сродкамі. А калі іх не стала – святкавалі перамогу. Толькі дарэмна. Праз некалькі гадоў нельга было даць рады насякомым, што пладзіліся неймаверна хутка. Хімічныя сродкі барацьбы дапамагалі слаба. І прыйшлося кітайцам завозіць вераб’ёў з Канады і іншых краін. Зараз гэтыя птушкі там ахоўваюцца”* [1, 89]. Пісьменнік, знаўца гісторыі, прасочвае па кольцах спілаванай сасны лёс дрэва: *“Сведкай розных падзей была сасна. Нарадзілася з маленькага насення недзе ў 1762 годзе, калі землі нашы ўваходзілі ў склад Рэчы Паспалітай. Ужо старым дрэвам сустрэла сасна грамадзянскую вайну. А ў час Вялікай Айчыннай ёй пераваліла за 180 гадоў. Усяго ж пражыла сасна 231 год. На “памяці” яе нямала драматычных падзей, што перажыў шматпакутны беларускі народ”* [1, 32].

Творы У. Пугача багатыя ***музычным*** і ***выяўленчым*** патэнцыялам, што як нельга лепш дапамагае спасцігнуць іх ідэйна-мастацкую адметнасць. У мініяцюрах прырода часцей за ўсё персаніфікаваная субяседніца, дарадчыца, сведка: *“Пакрысе лес апранаецца лісцем. <...> Умыўшыся расталай вадой, прачнуліся першакветкі: чубаткі, жоўтая гусіная цыбуля, трохколерныя фіялкі. ...высунула ліловыя закруткі папараць”* [2, 27]. Відавочнае захапленне пісьменніка шматколернасцю жыцця, яго жаданне праз каларыстычнасць апісання перадаць усе фарбы ляснога царства адчуваецца ў наступным урыўку: *“...на калматай сцяблінцы падвешаны пунсовыя, блакітныя і сінія кветкі медуніцы. Быццам у прыродзе не хапіла аднолькавай фарбы”* [2, 27]. Каляровая жывапіснасць, акварэльнасць вельмі ярка выражана ў ранішніх пейзажах: *“Зямля прынімала свае дзённыя фарбы, зялёныя, сінія, жоўтыя. Туман знікаў увачавідкі, толькі ружовы водбліск па-ранейшаму ляжаў на ўсім, як напамінак, што час яшчэ вельмі ранні”* [5, 50].

У. Пугач захапляецца няспынным рухам жыцця, *“птушыным рознагалоссем”* [2, 30]. Вось як паэтычна апісаны самы, здавалася, звычайны золак ля ракі: *“Але гэта яшчэ не дзень, а ранняя і вельмі ранняя раніца. Ды толькі затока Пціча неспакойна: у вадзе гуляюць невялікія рыбкі, ныраюць жукі-плавуны, дафніі, цыклопы, бакаплавы. Чуюцца ўсплёскі рыб. Загайдаліся сцяблы чароту і, разразаючы водную гладзь, паказалася галава нейкага звера. Ды гэта ж бабёр! Праз хвіліну ўжо працаваў ён у лазовым кусце воддаль ад мяне”* [2, 29]. Пісьменнік-публіцыст надзелены яшчэ і вельмі тонкім слыхам, які ў прыродным аркестры гукаў пры *“нараджэнні дня”* [2, 29] адрозніваe галасы асобных насельнікаў птушынага царства як музыкант-прафесіянал: *“Ужо некалькі хвілін я сяджу пад кустом лазы і назіраю за нараджэннем дня. Дзесьці спрасонку каркнуў грак. З шумам праляцеў невысока бусел. Закукарэкаў у зарэчнай вёсцы певень. Затарахцела, быццам у бубен, сарока, запішчалі лясныя канькі, сініцы, пішчухі. У паветры перакульваецца кулік. З далёкага балота даносіцца трубны прызыў жураўлёў. У гэтую гармонію ўліваецца яшчэ адзін голас – просты, нехітры “ку-ку, ку-ку”. І вось ужо лес зазвінеў мноствам галасоў. Якіх толькі няма сярод іх! Тонкія і пяшчотныя, спакойныя і басавітыя, млявыя і задумлівыя”* [2, 29]. Або яшчэ: *“Усе жабы – істоты галасістыя. Прычым вакальныя іх таленты выяўляюцца, як звычайна, у шлюбны перыяд. І ў кожнага земнаводнага свій голас. Так, травяныя жабы бурчаць, вастрамордыя булькаюць, зялёныя азёрныя квакаюць, жарлянкі “кумкаюць”, а квакшы так чутна крычаць, хоць вушы затыкай”* [1, 110]. Нездарма вабяць пісьменніка і *“птушыныя серэнады”*, і *“трэлі салаўя”* [1, 27]. Цудоўна было б да ўрокаў падабраць адпаведныя творы выяўленчага і музычнага мастацтва да прадэманстраваных урыўкаў.

Аналіз твораў У. Пугача-публіцыста як асобных тэкставых адзінак, такім чынам, дэманструе, як можна знаходзіць тыя “монакрышталі”, на аснове якіх ажыццяўляецца інтэграцыя розных школьных прадметаў у адзінае цэлае; як тэкст можа аб’ядноўваць розныя прадметы ў адзіны інтэгратыўны блок; як тэкст дапамагае вырашаць адзіную педагагічную задачу навучання і развіцця сродкамі некалькіх прадметаў.

МГПУ им. И.П. Шамякина

**Літаратура**

1. Пугач Уладзімір. Флейтавыя гукі: Для шк. ўзросту / Уладзімір Пугач. – Мн. : Ураджай, 1998. – 125 с.
2. “Галасы Палесся”: Літ. -публіц. альманах пры Петрыкаўскай раённай газеце “За новыя рубяжы” / Рэд. І. Самахвалаў. – № 2. – 1993. – 98 с.
3. Пугач У. Настойлівая рыжуха // Петрыкаўскія навіны. – 2010. – 20 лютага (№ 13). – С. 8.
4. Пугач У. Крумкач і ліса // Петрыкаўскія навіны. – 2010. – 10 лютага (№ 10). – С. 6.
5. “Рачныя напевы”: Літ. -публіц. альманах пры Петрыкаўскай раённай газеце “За новыя рубяжы” / Рэд. -уклад. І. Самахвалаў. – № 3. – 1994. – 120 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина